# Прамова тав Гея

Таварышы! Паміж XII і XIII зьездам партыя прайшла багаты зьместам шлях. Посьпехі індустрыялізацыі краіны, шпаркае разгортваньне прамысловасьці стварылі базу для разьвіцьця колгаснага руху. Соцыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы вырас і ўмацаваўся. Гэта абумовіла пераход партыі да політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы.

Пабудова соцыялізму ў нашай краіне зрабіла шпаркія посьпехі.

Партыя не магла-б дасягнуць гэтых посьпехаў, калі-б пасьлядоўна і няўхільна не праводзіла генэральнай лініі. Непрымірымай барацьбе з правым ухілам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, партыя абавязана тым дасягненьням, якія яна мае.

Вядучы барацьбу на два франты, перамагаючы ўсялякага роду ўхілы ад асноўнай лініі партыі, партыя разьбіла ўшчэнт рэшткі контр-рэволюцыйнага трацкізму і дала адпор „левым“ загібам, якія стварылі пагрозу паслабленьня змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства.

Адначасова з барацьбой супроць правага опортунізму, наша партыя правяла рашучую барацьбу з нацыянал-опортунізмам — з рознаколернасьцю правага опортунізму ў нацыянальным пытаньні. Партыя дала адпор беларускаму нацыянал-дэмократызму, а таксама шовінізмам усялякага колеру, вялікадзяржаўнаму шовінізму, яўрэйскаму, польскаму і інш.

Гэта няўхільная барацьба партыі за праведзеньне генэральнай лініі і посьпехі ў гаспадарчым будаўніцтве мобілізавалі актыўнасьць рабочае клясы, стварылі ў рабочай клясе нябывалы вытворчы ўздым.

Рост актыўнасьці рабочае клясы выявіўся і ў разгортваньні самакрытыкі. У гэтай галіне наша організацыя мае пэўныя посьпехі, хоць мы і павінны прызнаць, што самакрытыка разгорнута ў нас яшчэ далёка невыстарчальна.

Работы нашага зьезду мы павінны весьці пад знакам дзелавой бальшавіцкай самакрытыкі. Зьезд павінен паказаць нам асноўныя шляхі, ідучы па якіх мы разгорнем і мобілізуем актыўнасьць рабочае клясы, будзем выхоўваць далей новыя пролетарскія кадры нашай партыйнай організацыі, з яшчэ большай пасьлядоўнасьцю, непрымірымасьцю мы будзем і надалей праводзіць барацьбу за генэральную лінію партыі.

Правая небясьпека ў сучасны момант узмацняецца. Аб гэтым сьведчаць проіскі опортуністых усіх колераў. Наш зьезд, займаючыся дзелавой творчай работай, разьбіраючы дзелавым парадкам дасягненьні і недахопы мінулага, павінен будзе прайсьці пад знакам рашучага адпору ўсялякім спробам скажэньня лініі партыі. Зьезд пакажа партыйнай організацыі той шлях, па якім мы яшчэ больш упэўненымі крокамі пойдзем да новых дасягненьняў і посьпехаў (бурныя воплескі).

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ